УДК 821.161.3 (04)*Станкевіч

К. В. КУШНАРОВА
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)

## “ПЕРАКУЛЕНЫ СВЕТ” У ТВОРАХ Ю. СТАНКЕВІЧА

Комплекснае паняцце “мастацкі свет твора” трывала замацаванае ў літаратуразнаўстве розных краін. Найважнейшай уласцівасцю яго з’яўляецца неадпаведнасць / нетоеснасць першаснай рэальнасці, выкарыстанне пісьменнікам не толькі жыццяпадобных але і умоўных форм выяўлення. У артыкуле робіцца спроба даследаваць такую рысу мастацкага свету твораў Ю. Станкевіча, як “перакуленасць”, ненатуральнасць існавання чалавека ў тых умовах, што яму прапануюцца. Таксама у рабоце вызначаюцца асноўныя прынцыпы пабудовы твораў пісьменніка.

Юры Станкевіч з твора ў твор даследуе адну і тую ж тэму. Пісьменніка цікавіць лёс беларускай нацыі ў тых умовах, у якіх яна апынулася, прайшоўшы нялёгкі шлях да сучаснасці. Практычна ўсе яго творы паказваюць свет, дзе парушана норма паводзін і большасць насельніцтва пасіўна прымае новыя ўмовы, што навязваюцца ім прыхаднямі з іншых месцаў, якія захопліваюць тэрыторыю, не саромячыся ўжываць жорсткія, часта крымінальныя меры для дасягнення сваіх мэт.

Зло, якое нясуць прыхадні мясцоваму люду, часта канцэнтруецца ў своеасаблівых месцах: хатах, якія пакінулі іх былыя гаспадары, часам пры вельмі няпростых абставінах. У рамане “Ліст у Галактыку «Млечны шлях»” (2002) такім месцам з’яўляецца жытло серыйнага забойцы Баравулі, які беспакарана забіваў жыхароў суседніх вёсак, пакуль яго нарэшце не паймалі, пасля чаго ягоная сям’я і сваякі вымушаны былі пакінуць дом, на які скіравалася помста суседзяў. Але нават разбураны, дом нібы выпраменьвае нядобрыя флюіды, якія прыцягваюць усялякую набрыдзь, апісаную аўтарам як “агідныя стварэнні”, што “адразу ж пачалі красці, гадзіць і разбэшчваць людзей праз наркотыкі” [1, с. 74]. Ю. Станкевіч называе гэты дом “мікрамадэллю, сімвалам усяго людства, якое дайшло праз вялікую кроў да стану шаленства і дэгенерацыі, і замест таго, каб рашуча пазбавіцца памылковых маральных вартасцей, працягвае апускацца ў вір самазнішчэння” [1, с. 75].

Адной з адзнак такога перакуленага становішча свету з’яўляецца той факт, што, на думку пісьменніка, натуральны адбор даўно пайшоў не ў той бок. Яшчэ у час французскай Камуны, назіралася знішчэнне людзей па расавай прыкмеце, тады як “хам, з’яўляючыся наадварот, асобай другога гатунку, ліхаманкава знішчаў гожых і разумных. Пачалося расчалавечванне чалавека і размнажэнне недачалавекаў” [1, с. 73]. Згаданы працэс, згодна з меркаваннямі аўтара, яшчэ больш выразна праявіўся ў часы рэвалюцыі 1917 года. Вынікам такога планамернага знішчэння лепшых прадстаўнікоў нацыі і з’яўляецца дэградацыя волі і здольнасці да здзяйснення годных учынкаў у тых, хто зараз жыве на беларускай зямлі.

Суцэльны гвалт, яўны і прыхаваны, які ўчыняюць над мясцовым людам прыхадні з далёкіх месцаў, можа быць пераможаны толькі сілай. Ідэальным выхадам з дадзенай сітуацыі было б аб’яднанне тутэйшага насельніцтва з мэтай аказаць арганізаванае супраціўленне тым, хто разбурае мясцовую мараль і разбэшчвае моладзь, ствараючы ўмовы для яе далейшай дэградацыі.

Любыя, нават самыя неверагодныя падзеі, кшталту наведвання іншапланецянамі звычайнага гораду, настолькі мала паддаюцца разуменню мясцовых жыхароў, што ўспрымаюцца як цалкам натуральныя, як у рамане “Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн” (2003). Згодна меркаванню Т. Тарасавай, фантастыка “Ю. Станкевіча матывавана перш за ўсё імкненнем стварыць выключную сітуацыю для разважанняў над філасофскай канцэпцыяй аб перспектывах чалавецтва і яго каштоўнасных арыенцірах” [2, с. 5].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Авантурныя і фантастычныя моманты ў творах празаіка, трэба адзначыць, сустракаюцца нярэдка. Кожны раз творца выкарыстоўвае іх, каб паказаць абсурднасць законаў гэтага свету, выправіць якую можна толькі з дапамогай звышнатуральных сіл.

Такія звышнатуральныя здольнасці маюць тры сястры з аповесці "Эрыніі", дзе фантастычнае пераплецена з рэальным так цесна, што пераход ад аднаго да другога не заўжды заўважаецца. Неверагодная здольнасць да пераўтварэння жанчын у фантастычных птушак – багінь помсты з'яўляецца ў іх як вынік вельмі складаных жыццёвых абставін, у якіх яны апынуліся, вымушаныя бараніць сваю годнасць і само права на жыццё. Менавіта гэтыя здольнасці дазваляюць крыху выправіць уладкаванне свету, зменьшыўшы колькасць тых, хто ўчыняе беспакараны гвалт над безабароннымі людзьмі.

Заўважаная многімі даследчыкамі адсутнасць табуіраваных зон, уласцівая творчай манеры пісьменніка, у спалучэнні з увагай да самых дробных нюансаў і дэталяў, а таксама смелым падыходзе да адлюстравання патаемных жыццёвых сфер, служыць у аўтара сродкам паказу трагічнага разладу паміж знешнім і ўнутраным жыццём чалавека XX стагоддзя. "Перакулены свет" твораў Ю. Станкевіча правакуе разбурэнне асобы, якая аказалася ці то пад пагрозай выгнання са звыклага асяродку, ці, наадварот, растварылася ў шэрай масе, няздольнай да асэнсаванага і рашучага ўчынку, нават калі пад пагрозай знаходзіцца само яе існаванне.

Вельмі выразна разлад паміж сацыяльным існаваннем чалавека і яго ўнутранымі памкненнямі паказаны ў аповесці "Апладненне ёлупа" (2003). Галоўны герой твора, Марка Ласкоў, вымушаны ў сілу абставін служыць ідэі, у якую не проста не верыць, але супраць якой паўстае ўся яго істота. Задуманы героем сабатаж, праз які павінна выявіцца свабодная воля чалавека, правальваецца, і сам ён гіне ў лагеры, але ж і грандыёзная па сваёй задуме будоўля Палаца Правадыра не ажыццяўляецца, бо вайна падыходзіць да самай сталіцы.

Законы мастацкага свету твораў пісьменніка ствараюць герояў-двайнікоў, якія з'яўляюцца антыподамі. У аповесці "Апладненне ёлупа" такімі антыподамі з'яўляюцца каменны ідал, якога выцягнулі з балота на радзіме Маркі ў часы яго дзяцінства, і мумія правадыра, выяву якога ў гіганцкім маштабе павінны стварыць пры дапамозе разлікаў героя. Кожны з "ёлупаў" нясе ў сабе пэўную ідэю, якая прыцягвае людскія душы. Ідэю правадыра герой лічыць д'ябальскай і таму спрабуе ажыццявіць адчайны ўчынак, які ў выніку прыводзіць яго да лагера і зрэшты смерці – "самага важнага, як ён лічыў, моманту ў жыцці кожнага чалавека" [1, с. 369]. У той жа час існаванне ідалаў самага рознага гатунку – з'ява вечная і нязводная.

Героі-двайнікі, з'яўляючыся антыподамі, выконваюць функцыю "крывога люстэрка", як Андрэй Корбат і яго праследавацель з раману "Ліст у Галактыку «Млечны шлях»". Прычым, што характэрна, праз нейкі час "крывое люстэрка" становіцца персанажа пераймае часткова вобраз думак свайго антыпода, або прызнае яго рацыю. Таксама мастацкі свет твораў пісьменніка ўтрымлівае і герояў, не маючых яўных рыс "двайніка", але якія часам захінаюць іншы персанаж, хаваючы яго з поля зроку, каб той меў магчымасць здзейсніць нейкі адчайны ўчынак, як сяржант Тамаш Лумона, які здолеў кінуцца пад колы лакаматыву, бо ўся ўвага "чысцільшчыка" Маркі Гіля была скіравана на вулічную спявачку (апавяданне "Праўнучка Арфея" (2010).

Яшчэ адной важнай адзнакай свету твораў пісьменніка з'яўляецца наяўнасць герояў-вар'ятаў. У аповесці "Шал" (2010) вар'яткай з'яўляецца Канстанцыя Віж, з якой павінны "выгнаць беса" айцец Віталь. Той факт, што дадзенае дзеянне так і не спраўджваецца і Канстанцыя не пазбаўляецца сваёй хваробы прыводзіць іншага героя твора да наступнай высновы-цытаты са святога пісання: "надыдзе час, калі ўсе ператворацца ў вар'ятаў. І таго адзінага, хто не звар'яцеў, тыя вар'яты і аб'явяць шаленцам" [4, с. 110]. Такім чынам, аўтар сцвярджае агульную ненармальнасць адлюстраванага ім свету як адзін з важнейшых прынцыпаў яго пабудовы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Хвароба Канстанцыі ў сваім небяспечным праяўленні мела вынікам забойства чалавека. Іншы тып вар'яцтва – імкненне да суіцыду, паказаны ў апавяданні "Гульня бронзавак у святле поўні" (1992). Тут аўтар даследуе сацыяльныя прычыны душэўнага дысбалансу гераіні Гання Януковай, жыццё якой прыйшло да лагічнага заканчэння. Факт, які не ў стане зразумець малады урач "з моднай трохдзённай шчэццю на загарэлым твары" [4, с. 238]. Відавочна, што ў дадзенай сітуацыі, мае рацыю хутчэй жанчына, стан якой мае свае вельмі трывалыя прычыны, а не урач, які гаворыць завучанымі штампамі. У гэтым выпадку герой-вар'ят Ю. Станкевіча таксама больш адпавядае законам будовы мастацкага сусвета аўтара.

Разам з паказам татальнай абыякавасці да ўласнай долі, абсалютнай няздольнасці да супраціву, якая ўласцівая большасці персанажаў пісьменніка, у творах дзейнічаюць (менавіта дзейнічаюць, адно гэта ўжо вылучае іх з натоўпу) і героі, якія маюць свой пункт погляду на жыццё, а таксама валодаюць досыць моцнай воляй і насмельваюцца кінуць выклік прыхадням, што не паважаюць мясцовае насельніцтва менавіта з прычыны няздольнасці апошняга да больш-менш прыстойнага адпору гвалту і нахабству.

Супрацьстаянне шматлікіх персанажаў пісьменніка жыццёвым абставінам і асяродку часта прыводзіць іх да адзіноты. Героя аповесці "Пераход" (2007) Антона Лашкевіча на адзіноту асуджае дыягназ лепра (праказа), які закрэслівае забяспечанае, спакойнае і шчаслівае жыццё. Вымушанае пустэльніцтва ў закінутай вёсцы, аднак, не пазбаўляе Антона ад умяшальніцтва парадаксальных законаў жыцця ў ягоны побыт. Уварванне Лідкі, што шукае ратунку ад бандытаў, вымушае Лашкевіча ўступіць у барацьбу з яе крыўдзіцелямі, якіх ён перамагае. Гэта, аднак, не выратоўвае дзяўчыну, а самому герою дае толькі спакой і адзіноту.

Амаль ва ўсіх творах Ю. Станкевіча прысутнічае сукупны вобраз чужынцаў, варожы мясцоваму насельніцтву. Асобныя прадстаўнікі "чужынцаў", хоць і маюць уласныя партрэтныя характарыстыкі, тым не менш успрымаюцца як частка нейкай аднароднай масы, якая здольная прайсціся па беларускай зямлі, расціскаючы ўсё на сваім шляху з тым большай верагоднасцю, што супраціў яе паступальнаму руху здольныя аказаць толькі нешматлікія героі-адзіночкі, як правіла, не надта добра прыстасаваныя ў жыцці. Пісьменнік папярэджвае: моц толькі ў адзінстве. Калі мы жадаем выжыць і захаваць сваю нацыянальную адметнасць, трэба навучыцца паўставаць на абарону свайго суседа, не разлічваючы, што пагроза пройдзецца побач і знікне сама сабой.

Надзвычайная ўвага, якую аўтар надае апісанню жахаў ваенных год і разважанням над сутнасцю людажэрства, як адной з праяў нялюдскасці чалавечага жыцця, у аповесці "Лавец святла поўні" (2004) прыводзяць яго да высновы пра беларускі народ як пра "народ-донар, кроў якога ўжо стагоддзі жывіць шматлікіх драпежнікаў і паразітаў" [1, с. 468]. Няздольнасць людзей, кшталту Сплюшкі, галоўнага героя твора, знайсці сваё месца на роднай зямлі ўспрымаецца аўтарам як агульнае няшчасце радзімы, якая вартая жалю, бо яе лёс прадвызначаны. Калі краіну пакідаюць лепшыя прадстаўнікі нацыі, то якія ж застаюцца? – задаецца пытаннем пісьменнік. Вывад відавочны і, нажаль, мала суцяшальны.

**Спіс літаратуры**

1 Станкевіч, Ю. Апладненне ёлупа: раманы, аповесці, апавяданні / Ю. Станкевіч. – Мн.: Рэд. газ. "Настаўн. газ.", 2005. – 560 с.

2 Тарасава, Т. М. Меніпея і экзістэнцыяльныя праблемы сучаснага чалавека ў творах Ю. Станкевіча і М. Уэльбэка / Т. М. Тарасава // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя філалагічных навук. № 2 (12) 2009. – С. 5–10.

3 Станкевіч, Ю. В. Мільярд удараў: аповесці, апавяданні, п'еса / Ю. В. Станкевіч. – Мінск: Галіяфы, 2008. – 324 с.

4 Станкевіч Ю. Шал: тэксты / Ю. Станкевіч. – Мінск: Галіяфы, 2012. – 318 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ